# І ПАЦЯГНУЛІСЯ ЧОРНЫЯ ДНІ АКУПАЦЫІ…

## З успамінаў А.А. Карпача, в. Каленікі

Сёлета Аляксандру Андрэевічу Карпачу споўнілася восемдзесят. І ўсе гады ён пражыў у сваёй невялічкай вёсцы Каленікі. Адлучаўся толькі, калі ў 1944-ым пайшоў на фронт, ваяваў з фашыстамі. Родная вёска яго - акуратная, чыстая і ўтульная. Цяпер многа хат пустуе, а тады, у пару маладосці ветэрана, тут жыло гэтулькі людзей! У вёсцы ўсяго некалькі прозвішчаў - тут усе, лічы, сваякі, жылі адной вялікай сям'ёй. 22 чэрвеня 1941 года - дзень пачатку вайны - вяскоўцы ўспрынялі як агульную страшную бяду. Вёска сцішылася, затаілася, болем і нянавісцю ў сэрцах людзей аддаваўся грукат падкаваных чаравікаў ворагаў па акуратнай вясковай брукоўцы.

- Напярэдадні, суботнім вечарам, я быў у Пархімаўцах. Ездзіў туды роварам паглядзець кіно, якое паказвалі ў былым панскім палацы, - успамінае Аляксандр Андрэевіч. - Памятаю, вяртаўся назад і дзівіўся, якая ціхая, светлая ноч. 22 чэрвеня яна самая кароткая, як кажуць, вечар з досвіткам сустракаецца. Дома раніцай селі снедаць. Маці кажа, між іншым, што чагосьці самалёты «разгуляліся» у небе, надта ж рана лётчыкі прачнуліся. Аэрадром ваенны быў у Барысаўшчыне, гэта цяпер Мастоўскі раён. Самалёты лягалі часта, і з нашай вёскі мы часцяком назіралі за іх палётамі. Але ў той дзень самалёты вялі сябе незвычайна: то куляліся, то свечкай узляталі ў неба, то прападалі за сцяной лесу.

Людзі павыходзілі з хатаў на поплаў, любаваліся тымі самалётамі. І не маглі даўмецца, што ж гэта так цяжка вухкае, аж уздрыгвае зямля, і з-за далёкага лесу цягнуцца ўверх слупы дыму. Ніхто з вяскоўцаў раней не бачыў паветранага бою і не ведаў, што гэта дзеецца.

Паснедаўшы, я зноў падаўся ў Пархімаўцы. Падлеткі, моладзь бавілі нядзельны час каля былога панскага палаца. А дзесьці пад палудзень з яго выйшаў настаўнік (ён жыў там, меў радыё) і ўсхвалявана сказаў: «Толькі што перадалі, што немец пачаў вайну з Савецкім Саюзам».

Я імчаўся дахаты, як мог, каб паведаміць землякам страшную навіну. Мой бацька быў старшынёй каленіцкага калгаса, і ў тую нядзелю якраз праводзіў сход у хаце. Я ўвайшоў і сказаў, што пачалася вайна. Ніхто не паверыў. Усе ведалі, што падпісаны пакт аб ненападзенні, што вайны быць не можа.

Бацька вывеў мяне ў сені. «Ты што, з глузду з’ехаў? Што гародзіш? Ды за такія словы ведаеш куды можаш трапіць?» – насварыўся ён.

Крыху пазней на кані прыскакаў чалавек з Пархімаўскага сельсавета і крыкнуў на вуліцы: «Пачалася вайна!»

А ўзрывы за лесам былі ўсе больш чутныя... Калі праз некалькі дзён да вёскі з боку Данілак падышлі фашысты - яны ехалі абозам, на матацыклах і роварах - мы, хлопцы, хавалі свае ровары. Задымілі на падворках, у садках палявыя кухні, кастры, пайшлі ў ход куры, яйкі. І пацягнуліся чорныя дні акупацыі. Фашысты расстралялі дваіх чырвонаармейцаў, якія хаваліся ў вёсцы. Многіх вяскоўцаў забралі ў турмы, канцлагеры, на прымусовыя работы ў Германію...

Аляксандр Андрэевіч змаўкае. Цяжкія успаміны. Сам ён будаваў пад прымусам фашыстаў дарогу ад Кватараў на Баброўнікі. Потым - фронт, вярнуўся адтуль інвалідам. У вайну загінуў яго старэйшы брат. Няма ў Каленіках хаты, якую б чорным крылом бяды не накрыла вайна. Ветэран дажыў да 60-гадовага юбілею вызвалення роднай Беларусі, роднай вёскі. Гэта для яго вялікае і светлае свята!

Марыя Драпеза, в. Каленікі, 2004 г.